# НАЗОЎНІК

## Змяненне назоўнікаў па склонах

**Успомніце**

Што вы ведаеце пра назоўнік?
Выкарыстайце схему.

**Назоўнік** (х т о? ш т о?)

*рака* ***(яна, мая)***
*лес* ***(ён, мой)***
*возера* ***(яно, маё)***

***адзін — многа***
*рака — рэкі*
*лес — лясы*

падышоў (д а ч а г о?) *да возера*
прысвяціў (ч а м у?) *возеру*
любаваўся (ч ы м?) *возерам*
купаўся (у ч ы м?) *у возеры*

**123.** Прачытайце размову дзяўчынак па ролях.

Шэсць аднакласніц размаўлялі паміж сабой на перапынку.

Н а т а ш а. Да нас у клас **прыйдзе** новы вучань.

Р ы т а. Я яшчэ **не сустракала** гэтага вучня.

Д а ш а. Я **падару** новаму вучню прыгожую закладку.

В а л я. А я ўжо **бачыла** вучня і яго бацькоў.

Т а н я. Мы абавязкова **пасябруем** з гэтым вучнем.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Марына. Мы **скажам** пры вучню, што наш клас вельмі дружны.

Формы якога назоўніка ёсць у кожным сказе? Вусна пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

Выпішыце са сказаў назоўнік *вучань* разам з тымі словамі, ад якіх ставілі да яго пытанні. Абазначце канчаткі ў формах назоўніка.

Узор: *прыйдзе* (х т о?) *вучань* ☐
*не сустракала* (к а г о?) …

Змяненне назоўнікаў па пытаннях называецца **змяненнем па склонах (скланеннем).** У беларускай мове шэсць склонаў.

**124.** Разгледзьце табліцу. Прачытайце назвы склонаў, дапаможныя словы і склонавыя пытанні назоўнікаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Назоўны** | (ёсць) | х т о?<br>ш т о? | *вучань* ☐<br>*команд* *а* |
| **Родны** | (няма) | к а г о?<br>ч а г о? | *вучн* *я*<br>*каманд* *ы* |
| **Давальны** | (даць) | к а м у?<br>ч а м у? | *вучн* *ю*<br>*камандз* *е* |
| **Вінавальны** | (бачыць) | к а г о?<br>ш т о? | *вучн* *я*<br>*каманд* *у* |
| **Творны** | (ганарыцца) | к і м?<br>ч ы м? | *вучн* *ем*<br>*каманд* *ай* |
| **Месны** | (сумаваць) | (па) к і м?<br>(па) ч ы м? | *(па) вучн* *ю*<br>*(па) камандз* *е* |

?! Чаму ў кожнага склону два склонавыя пытанні, а не адно? Назоўнікі якога склону не ўжываюцца без прыназоўнікаў? Выкарыстайце дапаможныя словы і праскланяйце назоўнік *сшытак*.

Узор: Н. *ёсць* (ш т о?) *сшытак*
Р. …
Д. …
В. …
Т. …
М. …

**125.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вусна пастаўце пытанні да назоўнікаў і вызначце іх склон. Карыстайцеся падказкай.

Свеціць сонейка, грэецца пад сонейкам, дзякуем сонейку, няма сонейка, засумавалі па сонейку, убачыў сонейка.

Расце дрэва, расце на дрэве, зляцеў з дрэва, схаваўся пад дрэвам, пілаваў дрэва, дапамагчы дрэву.

Падказка: *свеціць* (х т о? **ш т о?**) *сонейка (Н.)*
*няма* (ч а г о?) *сонейка (Р.)*
*убачыў* (к а г о? **ш т о?**) *сонейка (В.)*

**126.** Прачытайце тэкст. Пра што даведаўся Рыгорка з пісьма старэйшага брата? Чаму быў рады малодшы брат?

## Салдацкае пісьмо

**Брат** Рыгоркі служыць на граніцы. Сёння хлопчык **атрымаў** ад яго пісьмо. Брат **напісаў** пра свайго сабаку Тора, з якім ён ахоўвае граніцу.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Сабака ўжо некалькі разоў **дапамагаў** гаспадару выканаць заданне камандзіра. Брат нават атрымаў узнагароду.

У **канцы** пісьма было напісана: «Я пазнаёмлю цябе з Торам, калі ты з бацькамі наведаеш мяне».

Хлопчык **радаваўся** пісьму, перачытваў яго раз за разам. Рыгорка ўжо **чакаў** гэтай сустрэчы.

Пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да розных форм назоўнікаў *Рыгорка, пісьмо, сабака.*

Выпішыце са сказаў гэтыя назоўнікі разам са словамі, ад якіх ставілі пытанні. Вызначце склон назоўнікаў.

Узор. *Брат* (к а г о?) *Рыгоркі (Р.), ...*

**Рм** Раскажыце пра вашых сваякоў, якія служаць або служылі ў арміі. Чаму служба ў арміі — ганаровы абавязак кожнага мужчыны?

**127.** Прачытайце скорагаворку.

**Паклікаў** Рыгорка Ягорку на горку,
**добра** з Рыгоркам на горцы Ягорку. *(М. Пазнякоў.)*

Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да назоўнікаў. Вызначце склон назоўнікаў.

**128.** Дапоўніце сказы патрэбнымі формамі назоўніка *коцік.* Вусна пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

У Андрэйкі **з'явіўся** прыгожы ... . Хлопчык вельмі **ўзрадаваўся** ... . Ён заўсёды **гуляе** з ... . Хлопчык

**корміць** ... малаком і мясам. Мама часта **купляе** для ... свежую рыбку. У школе Андрэйка часта **сумуе** па ... .

Запішыце сказы. Абазначце склон назоўніка *коцік.*

**129.** Вусна дапоўніце спалучэнні слоў назоўнікам *паштальён* у патрэбным склоне. Вызначце склон назоўніка.

Сустрэлі (к а г о?) ..., дзякавалі (к а м у?) ..., пагаварыла (з к і м?) з ..., не было (к а г о?) ..., гаварылі (п р ы к і м?) пры ... .

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце сказ.

**130.** Прачытайце. Формы якога назоўніка ёсць у кожным сказе? Вусна пастаўце да іх пытанні.

Учора Алегу прыйшла тэлеграма ад дзядзькі. Хлопчык ніколі яшчэ не атрымліваў тэлеграмы. Ён вельмі ўзрадаваўся тэлеграме. У тэлеграме было кароткае віншаванне з днём нараджэння. Імяніннік перачытваў тэлеграму некалькі разоў. Алег не расставаўся з тэлеграмай цэлы дзень.

**тэлегра́ма**

Выпішыце са сказаў гэты назоўнік разам са словамі, ад якіх ставілі пытанні. Вызначце склон назоўніка, абазначце канчаткі.

Узор. *Не расставаўся* (з ч ы м?) *з тэлеграм*[*ай*] *(Т.)*, ...

Выпішыце сказ, у якім назоўнік *тэлеграма* з'яўляецца дзейнікам. У якім склоне ўжыты гэты назоўнік у сказе?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Назоўнік у назоўным склоне з'яўляецца ў сказе дзейнікам: *Паштальён прынёс газету і паштоўку.*

**131.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння склону назоўнікаў у сказе.

1. Знаходзім у сказе ________ і ________ .

*Унучка павіншавала бабулю са святам.*

2. Назоўнік *унучка* з'яўляецца дзейнікам, стаіць у … склоне.

3. Знаходзім у сказе слова, ад якога паставім пытанне … .

к а г о?

*Унучка павіншавала* ***бабулю*** *са святам.*

4. Па пытанні вызначаем … .

В.

*Унучка павіншавала* ***бабулю*** *са святам.*

5. Знаходзім у сказе слова, ад якога паставім пытанне … .

з ч ы м?

*Унучка павіншавала бабулю* ***са святам.***

6. Па пытанні вызначаем … .

Т.

*Унучка павіншавала бабулю* ***са святам.***

**Рм** З чым яшчэ людзі віншуюць адзін аднаго? Каго вы нядаўна віншавалі? Як вы гэта рабілі? З чым нядаўна віншавалі вас?

**132.** Прачытайце верш. Вызначце склон назоўнікаў.



Пры **я**ліне, пры б**я**розе,
у пушчанскім гушчары,
у глухой б**я**рлозе
моцна спі**ць** м**я**дзведзь стары.

*В. Жуковіч.*

Назавіце ў сказе дзейнік і выказнік. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

*Творчая хвілінка*

На гербе якога горада Беларусі адлюстраваны мядзведзь? Чаму? Апішыце словамі гэты герб. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**133.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

1) Ціснуў, з, раніцы, мароз; 2) пары́пваў, пад, нагамі, снег; 3) сонца, лесу, з-за, яркае, паказалася; 4) святло, заліло, халоднае, вёску.

Вызначце склон назоўнікаў.

**134.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, коскі паміж аднароднымі членамі сказа.

Віхор наляцеў на *(ліпка)*. Дрэва густа зашумела. На *(зямля)* пасыпалася насенне. Вецер падхапіў адно зярнятка і панёс над *(зямля)*. Потым віхор сціх. Зярнятка апусцілася на *(зямля)*. Яно схавалася ў *(шчылінка)* заснула да *(вясна)*. *(Паводле Л. Арабей.)*

Абазначце склон назоўнікаў.



Правообладатель Акадэмія адукацыі